сам лирический герой стихотворения. Это переплетение образов свидетельствует о том, что все в мире едино и что соединяющим элементом является любовь, которая и воспевается в Песни Песней. По словам Г. В. Синило, эта «Книга, говорящая, казалось бы, языком плотской любви, стала эталоном языка, наиболее адекватного для выражения невыразимого – невоплотимого в слове духовного опыта, связанного с интуитивным постижением Бога, с *Даат Элогим* – Богопознанием» [5, с. 94].

Влияние символики и метафорики Песни Песней обнаруживается не только в рассмотренном нами стихотворении, но и во всей поэзии Джорджа Герберта и остальных поэтов-мистиков. Ведь именно эта библейская поэма позволяет проникнуть в недры души, в главный Храм любви – в сердце человека. Песнь Песней направляет душу в ее поисках навстречу Божественной любви и гармонии.

**Литература**


1. *George Herbert* The Temple // http://www.luminarium.org/sevenlit/herbert/herbbib.htm.
2. Song of Songs / The Hebrew Bible in English according to the JPS 1917 Edition // http://www.mechon-mamre.org/p/pt/pt3001.htm.
3. *Горбунов А. Н.* [Вступ. статья] // Английская лирика первой половины XVII века. М., 1989.
4. Песнь Песней / Пер. И. М. Дьяконова // Поэзия и проза Древнего Востока. М., 1973.
5. *Синило Г. В.* «Любовь, как смерть, сильна...» (Песнь Песней и ее рецепция в немецкой поэзии XVII века) // XVII век: между трагедией и утопией: Сб. науч. трудов. Вып. 1. М., 2004.


## СІМВОЛІКА НАЗВАЎ ДРАМАТЫЧНЫХ ТВОРАЎ ЯНКІ КУПАЛЫ


**Ю. А. Даманаў**


У духоўнай культуры Беларусі Янка Купала займае найважнейшае месца. Як геніяльны мастак слова, ён адчуў галоўны стрыжань гістарычнай трагедыі беларусаў і вывеў свой народ з рабскага прыніжэння духу, з няпамяці і няславы да новай духоўнай перспектывы. Янка Купала стаяў ля вытокаў беларускай нацыянальнай драматургіі. Постаці і сітуацыі ў яго драмах пераносяцца з побытавага ў іншае – філасофска-светапоглядное – вымярэнне, набываючы сімвалічны змест.

Актуальнасць аналізу сімволікі ў п`есах Купалы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя» абумоўлена надзённымі патрэбамі беларускай гуманітарнай думкі, скіраванай на пераасэнсаванне эстэтычнага досведу беларускай нацыі, на яе папулярызацыю, і сугучна з юбілейным годам (125-годдзем з дня нараджэння песняра і прарока Беларусі).

Мэта нашага даследавання – выявіць сімволіку ў назвах п`ес Купалы і звязаць яе з надзённымі сацыяльна-псіхалагічнымі праблемамі свайго часу.

Сімвалізм і сімвал – паняцці, цесна звязаныя паміж сабою, якія аналізуюцца даследчыкамі і вабяць сваёй таямнічасцю.

Сімвалізм – плынь у літаратуры канца XIX – пачатку XX стагоддзяў. У аснове сімвалізму ляжыць імкненне замяніць канкрэтны мастацкі вобраз, які нясе ў сабе абагульненне, вобразам-сімвалам(адсюль і назва плыні).

Сімвалы, створаныя беларускімі класікамі, адкрываюцца і разумеюцца ў кожны перыяд гісторыі па-рознаму. Сімвал ніколі не раскрывае перад чытачом усяго свайго зместу, а толькі тую частку, якая для чалавека ў дадзены момант актуальная, якую ён здольны зразумець, паколькі яна сугучна зменам у яго душы, а таксама разумовым пошукам і імкненням.

Нацыянальная літаратура асвоіла ўсё багацце народнай сімволікі, разам з тым пісьменнікі стварылі шэраг уласных сімвалічных вобразаў, якія дапамагаюць выявіць ідэйную задуму твора.

Свет сімвалаў, створаны класікамі, упарадкоўвае гісторыю народа, грамадства, краіны, звязвае з нашым калектыўным светаўяўленнем жыццё мінулае, сучаснае, будучае. Вобраз «новага Купалы», складанага і непрадказальнага творцы XX стагоддзя, прысутнасць нерэалістычных прынцыпаў у яго творчасці, «нелінейнасць» – гэтыя пытанні зацікавілі даследчыкаў яго творчасці яшчэ ў другой палове XX стагоддзя.

Талент Купалы праяўляўся ва ўменні спалучаць неспалучальнае.

Перачытваючы купалаўскія п`есы, мы ўпэўніліся, што Купала, творачы сімвал, паўстае як пясняр Адраджэння, філосаф, шукальнік сувязі паміж продкамі і нашчадкамі, бо геніяльным на думку Гі дэ Мапасана з`яўляецца толькі такі твор, які адначасова ўяўляе сабой сімвал і дакладнае ўвасабленне рэчаіснасці. Гэтыя словы трапна характарызуюць асаблівасці сімволікі ў драматургіі Янкі Купалы.

Вобразная сістэма Купалы нясе ў сабе ўсебакова развітую нацыянальна-своеасаблівую сімволіку, у якой арганічна спалучаны рэалістычны і рамантычны пачаткі. Гэтыя асаблівасці купалаўскай сімволікі выразна прасочваюцца ў «Паўлінцы», першым уласна драматургічным творы песняра, які прызначаўся для сцэны і быў пастаўлены яшчэ ў 1913 годзе.

Паўлінка – не толькі галоўная гераіня твора, яна – сімвал Маладой Беларусі, беларускай моладзі, бо яе маладосць, як нам бачыцца, атаясамліваецца не толькі з маладым насельніцтвам Беларусі, але і з новымі, адраджэнцкімі ідэямі, што запанавалі ў пэўным асяродку. На нашу думку, няўрымслівасць, самавітасць Паўлінкі – гэта падтэкст, які інтэрпрэтуецца як незалежнасць, годнасць, якія маглі б прывесці Маладую Беларусь да пачэснага «пасаду між народамі».

Сімвалічнасць назвы больш глыбока раскрываецца зместам п`есы: канфлікт паміж Паўлінкай і бацькамі таксама мае сімвалічны сэнс. Гэта, на наш погляд, як бы падрыхтоўвае і пацвярджае думку: «маладая» павінна заняць свой пачэсны пасад дзякуючы спадчыне, падрыхтаванай ёй «старой Беларуссю», яе матчыным клопатам, апекаю, згодаю.

Паўлінка застаецца дома, у сваім гняздзе. Яе шлях, як і шлях Маладой Беларусі, нагадвае кола, але ўжо без ранейшай безнадзейнасці. Паўлінчына вяселле не можа адбыцца ў дарозе, без бласлаўлення бацькоў. Маладая Беларусь не абыдзецца без Старой, без свайго спрадвечнага гістарычнага дому.

Сярод драматургічнай спадчыны Купалы асобае месца займае драма «Раскіданае гняздо», напісаная ў 1913 годзе ў Акопах.

Чытаючы вобразы-сімвалы «Раскіданага гнязда», мы прыйшлі да высновы, што драма Лявона Зябліка і яго радзімы універсальная: у п'есе ўвасобілася універсальная драма – разрыў чалавечых сувязей з абжытым асяроддзем, страта мікрасусвету, гібель чалавека, які стаў безабаронным перад халодным і жорсткім Сусветам, бо разбурылі не толькі хату Зяблікаў. «Раскіданае гняздо» – гэта ўся тагачасная Беларусь, адсюль і сімвалічны сэнс назвы твора. Па-іншаму раскрыўся для нас і трансфармаваны вобраз шляху: шляхі Зябліка ў разбегліся, але тупіковых сцяжынак тут няма, бо ўсе яны вядуць да аднае мэты – да пошукаў і аднаўлення «раскіданага гнязда» (Бацькаўшчыны), да набыцця людзьмі страчанай чалавечай годнасці.

Асэнсоўваючы сямейную трагедыю як агульнанародную, Купала паказаў цяжкі шлях беларускага сялянства ў пошуках страчанай бацькаўшчыны, зямлі і волі. У творы адлюстраваны рост свядомасці беларускага народа, абуджэнне сялянства да актыўнай барацьбы, прадчуванне перамен, якія павінны даць беларусам сацыяльнае і духоўнае вызваленне, вярнуць страчаныя правы. Твор мае глыбокі сацыяльна-філасофскі сімвалічны змест.

На пачатку ХХ стагоддзя адбыліся вялікія змены ў палітычна-грамадскім жыцці краіны. Купала не хавае трывогі, ён асуджае пасіўнасць, згубнае маўчанне, разгубленасць, якія праяўляліся суайчыннікамі ў рашаючы момант гісторыі. Гэту праблему ён уздымае ў трагікамедыі «Тутэйшыя». Купала ўсведамляў, што гэта перыяд складаных супярэчнасцей новага часу. Гэта п`еса надзелена купалаўскім прароцкім духам.

Тутэйшыя – гэта людзі, што жывуць тут, на гэтай зямлі, але не адчуваюць сябе беларусамі, бо страцілі адчуванне роднае зямлі, згубілі карэнне, што звязвала іх з бацькаўшчынай; тутэйшыя страцілі адчуванне сваёй гістарычнай памяці і гістарычнага лёсу, сталіся паязджанамі ў гісторыі.

У п`есе вырашаюцца глабальныя пытанні: існаванне незалежнай Беларусі, лёс Бацькаўшчыны. Гэта твор аб тутэйшым насельніцтве, аб вытоках беларскага нацыянальнага характару, аб складанасцях душы звычайнага чалавека, аднаго з многіх тутэйшых жыхароў, аб нашых шляхах ад «тутэйшасці» да народнасці, калі людзі, аб`ядноўваючыся, становяцца нарэшце народам. З дапамогай вобразаў-сімвалаў шукаецца адказ на пытанне: «Людцы, што гэта з намі, з народам, з нашым краем? Што?».

У творчасці Купалы жыве ідэя «хаты» – свае «гаспадаркі», якая ў абагульненым выглядзе сімвалізуе беларускі «дом» – дзяржаву, дзе ўсё на месцы, усё як у людзей.

Купалаўскі вобраз-сімвал хаты мае ў гэтым творы ўжо іншае, змененае, дадатковае значэнне: цёплыя сцены хаты – гістарычнага дому – надзейна ахоўваюць мову, культуру, духоўнае быццё нацыі ад наступстваў сусветнага ліха, якое пагражае не толькі беларусам, але і кожнаму народу ў свеце.

Мара ўпарадкаваць свой гістарычны дом не пакідае Купалу. Але шлях (зноў знаёмы вобраз-сімвал) ён наўмысна пакідае неакрэсленым.

У трагікамедыі «Тутэйшыя» гучыць роздум пра шляхі і будучыню беларускага народа. Гэта п`еса надзелена гістарычнай відушчасцю, прароцкім духам.

У «Тутэйшых» існуе загадкавы, часам няўлоўны «другі план», які ствараецца Купалам дзякуючы адметнасці сімволікі.

У драматургічных творах Янкі Купалы вобраз шляху то замыкаецца ў кола, то абарочваецца трагічным абрывам (самагубства Лявона) у п`есе «Раскіданае гняздо», то выводзіць на ростані, крыжавыя дарогі да вобраза-сімвала крыжа (шляхі сямейнікаў Зябліка). Дабрабыт, парадак, прыстойнасць у хаце звычайна бывае звязаны з вобразам жанчыны, гаспадыні. Яна з’яўляецца ў п`есах то ў абліччы Маладой (Паўлінка, Аленка, Зоська), то Старой (Ганула, Марыля).

Сімптаматычна, што ні ў адной з п’ес вяселля не адбываецца, хаця яго вобраз прысутнічае то як рамантычная мара («Паўлінка»), то як заяўлены намер (у трагікамедыі «Тутэйшыя»).

Сістэма вобразаў-сімвалаў у п`есах Купалы дынамічная і шматсэнсавая, яна цэласная і арганічная, але ў той жа час супярэчлівая і незавершаная, адкрытая. Гэтая незавершанасць, унутраны разлад і ёсць праява таго няўлоўнага, але істотнага пачатку, што абумоўлівае ўнутраны рух мастацкага свету Купалы, яго адвечную і незнішчальную актуальнасць і прасочваецца ў п`есах.

Купала застаўся глыбока самабытным аўтарам у тварэнні ўласнай мадэлі нацыянальнага свету, у трактоўцы праблемы гістарычнага лёсу, у

асэнсаванні феноменаў тутэйшасці і паязджанства. Чуйны да ўсялякіх праяваў гвалту над чалавекам, Купала асуджае крывавыя войны і рэвалюцыі, а гістарычную драму Беларусі разглядае як вынік сусветнай неўладкаванасці, дысгармоніі, перакладзенай на мову сімвалаў.

Купалаўскі сімвалізм сведчыць пра універсальную значнасць творчасці класіка. Пры гэтым Купала заставаўся глыбока самабытным і адметным. «Прыроднасць» купалаўскай творчасці спалучаецца з кніжнай культурай, арыентацыяй на сусветную літаратурную класіку і авангард.

На прыкладзе разгляду сімволікі назваў п`ес Янкі Купалы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя» можна сцвярджаць, што, нягледзячы на «ўзрост» твораў, у іх пастаўлена нямала надзённых праблем і ў прыхаваным выглядзе – дзякуючы вобразам-сімвалам! -- даецца папрароцку відушчы адказ на шмат якія сучасныя пытанні.

## ФЕМИНИСТСКОЕ ДВИЖЕНИЕ В СОВРЕМЕННЫХ МЕЖДУНАРОДНЫХ ОТНОШЕНИЯХ

**И. В. Жаркевич**

Зародившееся в период Великой Французской революции на этапе перехода от традиционного к современному обществу, феминистское движение сыграло значительную роль в развитии и трансформации политической и социальной системы национальных государств. Будучи наряду с рабочим движением одним из самых заметных движений начала 20 века, феминистское движение было локализовано в пределах конкретных стран и их деятельность не выходила за рамки национальных государств.

Несмотря на международный резонанс достижений феминистских движений в отдельных странах мира в начале 20 века, несмотря на попытки интернационализации деятельности движения в 20-ые гг. 20 века, феминистское движение в международных отношениях первой половины 20 века было просто невидимым. Такая ситуация длилась фактически до провозглашения Женской Декады ООН, последствия которой далеко превзошли ожидания ее организаторов: из женского движения родилось международное феминистское движение, которое стало не просто видимым в международных отношениях, а слышимым и влиятельным актором на международной арене. При этом проблемное поле деятельности движения расширилось с проблемы улучшения положения женщин до проблемы трансформации всей совокупности общественных отношений, основанных на гендерном неравенстве. В связи с этим возникает закономерный вопрос о месте, которое занимает феминистское движение в современных международных отношениях.